**А. І. Кулага Г. А. Качан**

# РОЛЯ ДУХАВЕНСТВА Ў ПАДПОЛЬНЫМ І ПАРТЫЗАНСКІМ РУХУ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ НА ПРЫКЛАДЗЕ СЯМ'І ХІЛЬТОВЫХ

Сёлета мы адзначаем 80-годдзе Вялікай Перамогі – падзеі, якая з’яўляецца важнай для кожнага беларуса, нашага народа і краіны. У барацьбе супраць захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны з’яднаўся ўвесь беларускі народ. Людзі розных сацыяльных груп, нацыянальнасцей і веравызнання самаахвярна змагаліся за сваю свабоду. Сваю лепту у барацьбу ўнесла і сям’я святароў Хільтовых з Клецкага раёна.

Хільтовы – спадкаемныя святары. Мікалай і Георгій былі дзецьмі святара Аляксандра Андрэевіча Хільтова. Як і бацька, яны абралі для сябе духоўны шлях, сталі святарамі. Нямецкая акупацыя застала Мікалая Хільтова ў сваім прыходзе Іаана-Прадцечынскай царквы (цяпер в. Садовая Клецкага раёна), Георгій служыў у Клецкай Пакроўскай царкве.

Згодна з дадзенымі кнігі «Памяць. Мінская вобласць» і гісторыка Андрэя Блінца з красавіка 1942 года айцец Мікалай быў сувязным партызанскага атрада імя Р. Катоўскага 300-й партызанскай брыгады імя К. Варашылава, якая дыслацыравалася ў Капыльскім раёне. У яго доме хаваліся дыверсанты, лекаваліся параненыя, зберагалася зброя для партызан. У партызанскай характарыстыцы пра дзейнасць святара сказана: «Тав. Хільтоў сістэматычна перадаваў каштоўныя звесткі па разведцы, вёў работу па разлажэнні паліцэйскага гарнізона г. Клецка, своечасова паведамляў пра паліцэйскія і нямецкія засады. Забяспечваў партызан неабходнымі прадуктамі харчавання. Усе заданні выконваў сумленна і акуратна». Яго называлі «партызанскім бацюшкам».Яго жонка Наталля і дачкі Надзея і Кіра актыўна ўдзельнічалі ў падпольнай дзейнасці: перапісвалі лістоўкі і дапамагалі ў лячэнні параненых.

Брат Мікалая Георгій Хільтаў арганізаваў перадачу ежы ваеннапалонным, якіх утрымлівалі ў лагеры на тэрыторыі былога ваеннага гарадка, выратаваў яўрэйскіх дзяцей, хрысцячы іх і выдаючы дакументы.

6 красавіка 1944 года гітлераўцы арыштавалі братоў Хільтовых. Браты трапілі ў лагер смерці ў Калдычаве, дзе падвергліся жахлівым выпрабаванням. Мікалая катавалі і спалілі жыўцом, а Георгія з жонкай расстралялі ў ліпені 1944 года.

Сведкам падзей ў Калдычэўскім лагеры быў паэт Сяргей Новік-Пяюн, які знаходзіўся з братамі ў апошнія дні іх жыцця. Яго ўспаміны пра тыя трагічныя часы былі перададзены дачцэ Георгія Хільтова Валянціне Гаховіч і былі апублікаваны ў газеце «Голас Радзімы». Імёны закатаваных святароў і іх родных упамінаюцца таксама ў кнігах Г. Паромчыка «Калдычэўская трагедыя» і Б. Шэрмана «Барановичское гетто. Колдычевский лагерь смерти».